Тэма: “Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове”

Мэта: стварэнне ўмоў для ўзнаўлення і пашырэння ведаў вучняў пра асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове ў параўнанні з рускай мовай.

Задачы:

умець прымяняць на практыцы правіла пра асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове;

умець вызначаць від сінтаксічнай сувязі ў словазлучэннях;

умець знаходзіць у тэксце словазлучэнні, звязаныя кіраваннем;

умець перакладаць словазлучэнні з рускай мовы на беларускую, улічваючы асаблівасці кіравання і дапасавання ў беларускай мове ў параўнанні з рускай;

умець працаваць з апорнымі табліцамі, алгарытмамі;

умець адрозніваць свабодныя словазлучэнні ад несвабодных;

фарміраваць уменне свабодна карыстацца гэтымі моўнымі адзінкамі ў маўленні.

Тып урока: камбінаваны

Абсталяванне: мультымедыйны праектар, апорная табліца, карткі з заданнямі, слоўнік А. Л. Баярынай і В. Н. Сіўчыкава “ 2000 русских и 2000 белорусских идиом, фразеологизмов и устойчивых словосочетаний”, карткі рэфлексіі, …

I. Арганізацыйны момант.

Настаўнік. Добры дзень, шаноўныя вучні!
Здаўна вядома, што галоўнае ў характары беларуса – гэта гасціннасць да добрых людзей. І сёння я хачу запрасіць вас на ўрок беларускай мовы ў нашу хату.
Звернемся да дэвіза ўрока: “ Усе мы з хат!”
Нельга не пагадзіцца з гэтымі словамі Янкі Сіпакова, сапраўды, тут наш пачатак і тут наш працяг. Менавіта з роднай хатай звязаны ў нас самыя шчаслівыя моманты ў жыцці.

II. Праверка дамашняга задання.

Настаўнік. А зараз звернемся да дамашняга задання.

Успомнім, якую тэму мы вывучылі на папярэднім уроку?

(Вучань. Мы вывучылі тэму “Словазлучэнне, спосабы сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні).

Настаўнік. Якое было дамашняе заданне?

Вучань. Трэба было выканаць заданне на картках. Неабходна было вызначыць від сувязі ў словазлучэннях і запісаць адказ у выглядзе лічбавага шыфра:

1 – калі від сувязі ў словазлучэнні дапасаванне;
2 – кіраванне;
3 – прымыканне;
0 – словы звязаны злучальнай сувяззю і словазлучэннем не з’яўляюцца .

Настаўнік. Дзякую. Ці ведаеце вы, што, засяляючыся ў новую хату, нашы продкі карысталіся чароўнай магіяй лічбаў?

І зараз пры дапамозе такой магіі лічбаў мы праверым, наколькі правільна вы справіліся з дамашнім заданнем.
Увага! Параўнайце свае адказы з адказамі, пазначанымі на мультымедыйным экране: (А – 1203102313; Б – 2132013210)

***Дамашняе заданне***

*Заданне 1*. ***Вызначце від сувязі ў словазлучэннях і запішыце адказ у выглядзе лічбавага шыфра:***
***Побач са словазлучэннем пастаўце лічбу:***
***1 – калі від сувязі ў словазлучэнні дапасаванне;***
***2 – кіраванне;***
***3 – прымыканне;***
***0 – словы звязаны злучальнай сувяззю і словазлучэннем не з’яўляюцца.***

| А | Б |
|---|---|
| 1) пяты кіламетр; | 1) папіўшы соку; |
| 2) выкананы ўсімі; | 2) у бязвоблачным небе; |
| 3) неба і зямля; | 3) размаўляць па-сяброўску; |
| 4) надзвычай прыемны; | 4) расце ў лесе; |

| | |
|---|---|
| 5) яго кніга;<br>6) растуць кветкі;<br>7) паехаць у млын;<br>8) ішлі не спяшаючыся;<br>9) скошаны луг;<br>10) просьба дапамагчы. | 5) каля берага;<br>6) бацькаў дар;<br>7) гаварыў ціха;<br>8) сукенка з шоўку;<br>9) мой брат;<br>10) будзем вучыцца. |

*Заданне 2.* ***Запоўніце табліцу, вызначце від падпарадкавальнай сувязі, від паводле галоўнага слова і сэнсава-граматычныя адносіны ў словазлучэннях.***

| № | Словазлучэнне | Від падпарадкав. сувязі | Від паводле галоўнага слова | Сэнсава-граматычныя адносіны |
|---|---|---|---|---|
| **1** | Свежае паветра | | | |
| **2** | Добра падрыхтаваны | | | |
| **3** | Жыць па-новаму | | | |
| **4** | Хадзіць у ягады | | | |
| **5** | Паліваць агарод | | | |
| **6** | Каманда лыжнікаў | | | |
| **7** | Дзіцячыя галасы | | | |
| **8** | Спадніца з шоўку | | | |
| **9** | Пяцёра куранят | | | |
| **10** | Тром хлопцам | | | |
| **11** | Дзікія гусі | | | |
| **12** | Наш сусед | | | |
| **13** | Для яго сястры | | | |
| **14** | Зварыць капучына | | | |

Настаўнік. Падніміце рукі, у каго ёсць нейкія недахопы. Давайце патлумачым дапушчаныя памылкі.

А зараз давайце ўспомнім, якім правілам вы карысталіся, каб правільна выканаць заданне.

Задайце пытанні па вывучанай тэме.

1. Які від сувязі слоў у словазлучэннях называецца дапасаваннем? Прывядзіце прыклады.
2. Які від сувязі слоў у словазлучэннях называецца кіраваннем? Прывядзіце прыклады.
3. Які від сувязі слоў у словазлучэннях называецца прымыканнем? Прывядзіце прыклады.
4. Якія спалучэнні слоў не з'яўляюцца словазлучэннямі? Прывядзіце прыклады.

Настаўнік. А зараз адкрыйце сшыткі і запішыце дату.

III. Этап актуалізацыі ведаў.

Звернемся да тэксту. (Вучань чытае тэкст уголас).

1. Зойдзем на падворак хаты, ступім на ганак таго бацькоўскага дома, дзе для кожнага з нас пачынаецца шлях у жыццё і яго бясконцасць.
2. Адсуль ідуць мае карані. Тут ажаніўся мой прадзед з прабабуляй, тут яны гадавалі дзяцей, цешыліся з іх і адсюль выпраўлялі ў людзі. Тут клапаціліся пра будучы ўраджай і дзякавалі Богу за здароўе і дабрабыт.
3. Хата – жылы сялянскі будынак. У хаце стаялі ложкі, **куфар** для адзення, гаспадыніны **кросны** ці **калаўрот**. Ад печы ўздоўж глухой, без вокнаў, сцяны размяшчаліся палаці. Асобнае месца, бліжэй да **покуці**, займаў стол з услонамі. Упрыгожвалі хату тканыя посцілкі і ручнікі.
4. Але мала і няўдзячна назваць хату проста жылым будынкам. Хата – наша калыска, куды мы вяртаемся з блізкіх і далёкіх дарог.

Пытанні да тэксту:

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту.
2. Ці можна сказаць, што слова хата ў тэксце мнагазначнае? Дакажыце, чаму вы так лічыце.
3. Вызначце сродкі сувязі сказаў ў першым і другім абзацы тэксту.

1V. Пераход да падачы матэрыялу па новай тэме.
<u>Настаўнік.</u> Калі ласка, з другога абзаца тэксту выпішыце словазлучэнні, звязаныя сувяззю кіравання. Падкрэсліце дзеяслоў у кожным словазлучэнні і вызначце склон назоўніка. Зачытайце выпісаныя словазлучэнні.

Вучань:
(*ажаніўся з прабабуляй, гадавалі дзяцей, цешыліся з іх, выпраўлялі ў людзі, клапаціліся пра ўраджай, дзякавалі Богу*).
<u>Настаўнік</u>. Падумайце, што вы можаце сказаць пра асаблівасці ўжывання такіх словазлучэнняў у беларускай мове ў параўнанні з рускай?
<u>Настаўнік.</u> Значыць, мы можам сфармуляваць тэму нашага ўрока: “Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове”.
<u>Настаўнік.</u> Прадоўжыце сказ так, каб былі сфармуляваны задачы нашага ўрока.

*Узнавіць і сістэматызаваць веды ……..*
*Выпрацоўваць уменне знаходзіць…..*
*Развіваць здольнасць…*
*Выхоўваць пачуццё….*
<u>Настаўнік.</u> Гэта тэма вам добра вядомая з 8 класа. Таму ўзнаўляць веды па тэме мы будзем у працэсе выканання практычных заданняў. А калі ў вас узнікнуць цяжкасці, за дапамогай звярніцеся да карткі-памяткі, якая ёсць у кожнага з вас [дадатак 1].

Беларускай мове ўласцівы пэўныя законы ў будове словазлучэнняў, якія адлюстроўваюць нацыянальную адметнасць роднай мовы. Звернемся непасрэдна да гэтых асаблівасцей пабудовы словазлучэнняў у беларускай мове (вучні даюць вусны каментарый да прыкладаў з карткі-памяткі).

V. Замацаванне.
(На дошцы загадзя запісаны словы, настаўнік адкрывае дошку)
<u>Настаўнік.</u> Увага! На дошцы запісаны словазлучэнні, знайдзіце сярод іх няправільна ўтвораныя, выпраўце памылкі і запішыце ў сшытак правільна.

<u>*Запісаныя на дошцы словазлучэнні.*</u>
*Два сшытка, дзве пятых, дзякаваць бацьку, здзекавацца над дармаедам, ехаць за сенам, хварэць ангінай, хворы на адзёр, ісці ў грыбы, звярнуцца на адрас.*
<u>Індывідуальнае заданне для вучня-алімпіядніка</u>
<u>Настаўнік.</u> Пакуль усе выконваюць заданне, вучань-алімпіяднік папрацуе рэдактарам. Неабходна выправіць у тэксце сем выразаў, неўласцівых беларускай мове і запісаць іх правільна, а таксама знайсці пунктуацыйную памылку.

(*Міхалка – ён быў меншы сваёй сястры – хварэў грыпам. Але хвароба прайшла, і хлопчык пачаў выходзіць на двор, гуляць у саду. А яшчэ праз некалькі дзён ён зайшоў за таварышам, і яны разам пайшлі ў лес за ягадамі. Хлопчыкі ішлі і спявалі. Далёка чуваць было песню. Сустрэў хлопчыкаў стары дзед і сказаў ласкава: “Дзякую вас за песню. Беражыце родную песню, бо песня душа народа!”*).
<u>Настаўнік.</u> Праверым заданне.

Вучні чытаюць выпраўленыя словазлучэнні ( два сшыткі, дзве пятыя, здзекавацца з дармаеда, ехаць па сена, хварэць на ангіну).

Праверка індывідуальнага задання.
(Міхалка – ён быў меншы **за сваю сястру** – **хварэў на грып.** Але хвароба прайшла, і хлопчык пачаў выходзіць на двор, гуляць у садзе. А праз некалькі дзён ён зайшоў **па таварыша,** і яны разам пайшлі ў лес **у ягады**. Хлопчыкі ішлі і спявалі. Далёка чуваць **была песня.** Сустрэў хлопчыкаў стары дзед і сказаў ласкава: “Дзякую **вам** за песню. Беражыце родную песню, бо песня **-** душа народа!”).
<u>Настаўнік.</u> А зараз правядзём арфаграфічную хвілінку. На дошцы запісана ўмова задання: *перабудуйце словазлучэнні, якія складаюцца з трох слоў, у адпаведныя па сэнсе словазлучэнні з двух слоў. Падкрэсліце ў складаным слове арфаграму, растлумачце яе правапіс.*

Прадукцыя добрай якасці – *дабраякасная прадукцыя;*
Хлопец з чорнымі валасамі – *чорнавалосы хлопец;*
Дзяўчынка з чорнымі брывямі – *чарнабровая дзяўчынка;*
Устойлівае да марозу паліва – *марозаўстойлівае паліва;*
Дзіця з шэрымі вачыма – *шэравокае дзіця.*
<u>Настаўнік.</u> Якія яшчэ выключэнні з правіла вы памятаеце? Запішыце складаныя словы, першая частка якіх пішацца нязменна.

(Напрыклад, вучні запісваюць такія выключэнні, ***як словаформа, штодзённы, мовазнаўства, фотакопія*** і г. д.)

Фізкультхвілінка.

Паглядзіце на экран. На ім нездарма размешчана карта Беларусі, бо адно з алімпіядных заданняў гучыць так: запісаць назвы беларускіх гарадоў, якія маюць формы толькі множнага ліку. І зараз мы з вамі паспрабуем паказваць месцазнаходжанне гэтых гарадоў адпаведнымі рухамі рук. Адпраўляемся мы ў падарожжа з Мінска. Калі горад знаходзіцца ў дачыненні да Мінска на захадзе, мы робім узмах левай рукой, на усходзе – правай, на поўдні – дзвюма рукамі ўніз, на поўначы – дзвюма рукамі ўверх.

<u>Настаўнік.</u> Сядайце, калі ласка, крыху адпачылі, працягнем працаваць.

А зараз прапаную вам пабыць перакладчыкамі. Каля дошкі будуць працаваць двое вучняў, а правяраць у іх заданне будуць больш моцныя вучні. І вучні каля дошкі, і вучні-куратары працуюць над адным і тым жа заданнем, але вучні-куратары пасля выканання задання ў сваіх сшытках будуць ажыццяўляць праверку задання каля дошкі.

| ***Запішыце па-беларуску*** *(самастойна ў сшыткі)* | ***Запішы па-беларуску*** *(каля дошкі) вучань 1* | ***Запішы па-беларуску*** *(каля дошкі) вучань 2* |
|---|---|---|
| Дом в пять этажей<br>(дом на пяць паверхаў).<br>Два раза в неделю (два разы на тыдзень).<br>Выбрать по своему вкусу (выбраць на свой густ).<br>Заведующая аптекой<br>(загадчык аптэкі).<br>Не выполнить из-за лени (не выканаць праз ляноту).<br>Старше всех (старэйшы за ўсіх).<br>Отрекаться от родного языка (адцурацца ад роднай мовы).<br>Думать про себя (думаць сам сабе).<br>Ухаживать за Машей (заляцацца да Машы)<br>Топить печь<br>(паліць у печы). | Прощать друга<br>(даравацъ сябру).<br>Смеяться над соседом<br>(смяяцца з суседа).<br>Говорить о событиях<br>(гаварыць пра падзеі).<br>Пойти в библиотеку за книгой (пайсці ў бібліятэку па кнігу).<br>Ходить по полям<br>(хадзіць па палях).<br>Выше отца (вышэйшы за бацьку).<br>По выходным дням<br>(у выхадныя дні).<br>Поехать на мельницу<br>(паехаць у млын).<br>У меня болит голова<br>(мне баліць галава).<br>В двух шагах от нас<br>(за два крокі ад нас) | Две большие собаки<br>(два вялікія сабакі).<br>Говорить об успехах<br>(гаварыць пра поспехі).<br>Забота о здоровье<br>(клопат пра здароўе).<br>Целых три дня<br>(цэлых тры дні).<br>Пойти за справкой<br>(пайсці па даведку).<br>Дальше всех<br>(далей за ўсіх).<br>Приехать к родителям<br>(прыехаць да бацькоў).<br>Заведующий канцелярией<br>(загадчык канцылярыі).<br>Всё в пользу Отчизны<br>(усё на карысць Бацькаўшчыны).<br>Жить по соседству<br>(жыць у суседстве). |

Індывідуальнае заданне для вучня-алімпіядніка.

Неабходна перакласці з рускай мовы на беларускую спецыфічныя беларускія словазлучэнні і фразеалагізмы. А памочнікам у гэтай нялёгкай справе будзе руска-беларускі слоўнік фразеалагізмаў і словазлучэнняў.

Идти по следу – *ісці ў сляды.*
Избавиться от прошлого – *пазбыцца былога.*
На днях – *гэтымі днямі.*
Биться об заклад – *ісці ў заклад.*
Бранить кого-либо – *сварыцца на каго-небудзь.*
Быть не при деньгах – *хварэць на кішэні.*
В последнее время – *апошнім часам.*
Ветром шатает – *з ветру валіцца.*
Витать в облаках – *думаць пра нябесныя міґдалы.*
Вступить в брак – *пабрацца шлюбам, узяць шлюб.*
Дрожать над каждой копейкой – *за капейку калаціцца.*

VI. Лексічная хвілінка.

Настаўнік. Зноў звернемся да тэксту. У трэцім абзацы тэксту выдзелены словы: куфар, кросны, калаўрот, покуць.

Растлумачце лексічнае значэнне гэтых слоў.Вучні спрабуюць патлумачыць лексічнае значэнне ўказаных слоў.

Настаўнік. Праверым сябе, звернемся да наступнага слайда.

А зараз першы варыянт прыдумае са словамі – кросны і калаўрот – словазлучэнні, звязаныя відам сувязі – дапасаванне;

Другі варыянт са словамі – куфар і покуць – словазлучэнні, звязаныя відам сувязі – кіраванне.

Ці можна прыдумаць з гэтымі словамі словазлучэнні, звязаныя прымыканнем? Дакажыце.

VII. Фразеалагічная хвілінка.

Настаўнік. Ці ёсць розніца паміж словазлучэннямі ў наступных парах:

Вывесці з аўтобуса – вывесці ў людзі;

Развязаць касынку – развязаць язык;

Сядзець на канапе – сядзець на шыі?

Вучань. Ёсць, словазлучэнні: вывесці з аўтобуса, развязаць касынку, сядзець на канапе – свабодныя. Кожнае з іх захоўвае сваё лексічнае значэнне і можа ўступаць у сувязь з іншымі словамі.

Вывесці ў людзі, развязаць язык, сядзець на шыі  - гэта гатовыя моўныя адзінкі з устойлівай будовай і значэннем, якія называюцца фразеалагізмамі.

Настаўнік. А зараз выбарачны дыктант. Выпішыце з прапанаваных словазлучэнняў толькі звязаныя (несвабодныя словазлучэнні):

*расплюшчыць вочы, згарэць ад сораму, пералётная птушка, распускаць рукі, чытаць кнігу, прыйсці ў галаву, сядзець на капане, абводзіць вакол пальца, хадзіць на задніх лапках.*

Растлумачце сэнс выпісаных фразеалагізмаў.

Настаўнік. Звярніце ўвагу на экран.). Паглядзіце, як прыгожа выглядае хата знадворку і як яе ўпрыгожваюць нашы кабеты. Звярніце ўвагу на мастацкае аздабленне хаты знадворку. Скажыце, як называюць майстра, які выразае з дрэва розныя выявы і фігуры (*разьбяр*).

Назавіце літаратурны твор, дзе галоўны герой – таленавіты народны мастак-разьбяр? (*Паэма “Люцыян Таполя”*).

Хто аўтар гэтай паэмы (*Максім Танк*).

Палюбуйцеся ўбраннем яе хаты. На вокнах вісяць маленькія занавесі з выбітымі пеўнікамі. Як называюцца па-беларуску такія занавесі?(*фіранкі*)

Вышытыя посцілкі ўпрыгожаны кружевамі, а па-беларуску… (*кужалем*).

Запомніце: кружева на посцілках – кужаль, а карункі аздабляюць бялізну і адзенне чалавека.

Вось так выглядае беларуская хата ў нашай вёсцы (фотаздымкі).

VIII. Дамашняе заданне.

І зноў вернемся да дэвіза ўрока: “Усе мы з родных хат”. Менавіта так гучыць і адна з тэм вуснага выказвання на рэспубліканскай алімпіядзе. І таму дамашняе заданне будзе наступнае: выкарыстоўваючы лексічны матэрыял урока (тэкст пра беларускую хату), наш мясцовы матэрыял, матэрыялы і цытаты з літаратурных твораў, напісаць сачыненне-мініяцюру “Усе мы з родных хат”. І зноў вяртаючыся да тэмы ўрока, хачу звярнуць вашу ўвагу на асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове.

IX. Падвядзенне вынікаў.

Пра якія асаблівасці пабудовы дзеяслоўных словазлучэнняў у беларускай мове вы сёння даведаліся?

Прывядзіце прыклады ўжывання некаторых адметных беларускіх словазлучэнняў.

Выстаўленне адзнак. Рэфлексія.

І ў заключэнні ўрока мне б вельмі хацелася даведацца, наколькі ўрок быў для вас карысным і цікавым. У вас на партах ляжыць сонейка, яно і дапаможа вам выказаць свае адносіны. Выберыце сваё сонейка ў залежнасці ад настрою: аранжавае  - вы ўсім задаволены, жоўтае – вам яшчэ ёсць над чым працаваць, салатавае – урокам не задаволены.

Падніміце свае сонейкі. Хачу закончыць наш урок народным выслоўем “Няхай загляне сонца і ў наша аконца”, якое паслужыла назвай для выдавецкай суполкі беларусаў у Пецярбургу напачатку 20 стагоддзя.

УЖЫВАННЕ ПРЫНАЗОЎНІКАЎ
(АСАБЛІВАСЦІ ДЗЕЯСЛОЎНАГА КІРАВАННЯ)

| ДЗЕЯСЛОЎ | ПРЫНАЗОЎНІК + СКЛОНАВАЕ ПЫТАННЕ | ПРЫКЛАДЫ |
|---|---|---|
| Дзякаваць<br>Выбачаць<br>Дараваць<br>(дзеясловы **ветлівасці**) | **(КАМУ?)**<br>**Давальны склон** | Дзякаваць бацькам,<br>дараваць сябру,<br>выбачайце мне |
| Смяяцца<br>Жартаваць<br>Рагатаць<br>Насміхацца<br>Кпіць<br>Цешыцца ….. | **З (СА)**<br>**Каго?**<br>**Родны склон** | Смяяцца з яго,<br>жартаваць з сябра,<br>здзекавацца са слабага,<br>кпіць з суседа |
| Хварэць<br>Захварэць<br>хворы | **НА (ШТО?)**<br>**Вінавальны склон** | Хварэць на грып,<br>хворы на сэрца |
| **Дзеясловы**<br>**МАЎЛЕННЯ**<br>**ДУМКІ**<br>***ПАЧУЦЦЯ***<br>Гаварыць, казаць<br>Распытваць<br>Разважаць<br>Думаць<br>Клапаціцца<br>**(адпаведныя назоўнікі:**<br>**Думка**<br>**Клопат**<br>**Разважанне**<br>**Гаворка …..)** | Часцей<br>**ПРА (КАГО? ШТО?)**<br>**вінавальны склон** | Гаварыць пра падзеі,<br>непакоіцца пра яго, думаць пра дзяўчыну, марыць пра сустрэчу, клопат пра дзяцей, мара пра будучыню |
| Дзеясловы руху<br>Ісці<br>Бегчы<br>Плыць<br>Ехаць . г.д.<br>**Дз. волевыяўленчыя**<br>**( пры абазнач. мэты дзеяння)**<br>Выправіць<br>Паслаць<br>прыслаць | **ПА , У**<br>**(КАГО?ШТО?)**<br>**Вінавальны склон** | Пайшоў у магазін па хлеб,<br>Паслаць па бацьку,<br>Схадзіць у бібліятэку па кнігу<br>АЛЕ!!!<br>**Пайсці ў грыбы,**<br>**Сабрацца ў ягады,**<br>**Збегаць у арэхі** |
| Ажаніць<br>ажаніцца | **З (СА)**<br>**(КІМ?)**<br>**Творны склон** | Ажаніцца з Марынай<br>Ажаніў са сваёй дачкою |
| Дзеясловы і аддзеяслоўныя назоўнікі са значэннем<br>Пачуцця<br>Смутку<br>Жалю<br>Тугі<br>**Сумаваць**<br>**Туга**<br>**Жалоба…** | **ПА**<br>**Месны склон** | Сумаваць па сыне,<br>Туга па родным краі, жалоба па ахвярах трагедыі |
| **ДЗЕЯСЛОВЫ СА ЗНАЧЭННЕМ ДЗЕЯННЯ** | **ПА**<br>**(КІМ? ЧЫМ?)**<br>**Месны склон** | Хадзіць па шляхах,<br>вандроўка па ваенных мясцінах |
| Хацець<br>Прагнуць<br>Жадаць Клянчыць<br>І падобныя, якія **абазначаюць просьбу, жаданне** | **(КАГО? ЧАГО?)**<br>**Родны склон** | Хацець цукерак,<br>прагнуць вады,<br>жадаць здароўя,<br>зычыць шчасця |
| КУПЛЯЦЬ<br>ЗБІРАЦЬ<br>( БЕСПРЫСТАВАЧНЫЯ) | **(КАГО?ШТО?)**<br>**Вінавальны склон** | Купляць хлеб,<br>збіраць грыбы |
| **На**купляць<br>**На**збіраць<br>( ПРЫСТАВАЧНЫЯ) | **(КАГО? ЧАГО?)**<br>**Родны склон** | Накупляць прадуктаў,<br>Назбіраць грыбоў |
| Параўнальныя словазлучэнні | Залежнае слова ўжываецца ў **ВІНАВАЛЬНЫМ СКЛОНЕ + ЗА** | Старэйшы за брата,<br>Зрабіў лепш за суседа |
| **Выражэнне прычынных адносін (из-за чего-то,кого-то)**<br>Аб'ектныя адносіны са значэннем пранікаць, прабівацца | **ПРАЗ** | Спазніўся праз дождж<br><br>Прабівацца праз гушчар |
| **АБ**<br>*ПРА* | Афіцыйны і дзелавы стыль<br>Гутарковы і мастацкі стыль | Закон аб сям'і<br>Клопаты пра дзяцей |
| **Для + Родны склон**<br><br>*дзеля* | Указвае на прызначэнне прадмета;<br>Пры вызначэнні адрасата,<br>Указвае на прадмет для якіх (у інтарэсах якіх) робіцца што-небудзь | Пакой для пасажыраў,<br><br>Купілі для нас<br>Усё робяць толькі дзеля цябе |
| **Послать за** врачом | **Паслаць ПА** доктара | |
| Багаты на (ШТО?) | | |

Некаторыя спецыфічныя беларускія словазлучэнні

| Па-руску | Па-беларуску |
|---|---|
| Думать, читать, смеяться про себя | думаць, чытаць, смяяцца самому сабе |
| Сказать по секрету | сказаць пад сакрэтам |
| Дом в три этажа | дом на тры паверхі |
| По случаю праздника (юбилея) | з нагоды свята (юбілею) |
| Два раза в неделю | два разы на тыдзень |
| Выбрать по  своему вкусу | выбраць на свой густ |
| Определить по вкусу | вызначыць на смак |
| Всё в пользу Отчизны | усё на карысць Бацькаўшчыны |
| Уход за больным (за цветами) | догляд хворага (кветак) |
| По направлению к реке | у кірунку да ракі |
| Не выполнить из-за лени | не выканаць праз ляноту |
| Грустить по причине | смуткаваць з прычыны |
| Заведующая аптекой | загадчык аптэкі |
| Не к месту, не к лицу | не да месца, не да твару |
| По моему мнению | на маю думку |
| Сказать во весь голос | сказаць на поўны голас |
| По всем направлениям | на ўсіх кірунках |
| По выходным дням | у выхадныя дні |
| Создан (сделан) по образцу | створаны (зроблены) на ўзор |
| Выучить стихотворение по выбору | вывучыць верш на выбар |
| Жить по соседству | жыць у суседстве |
| Готовиться к занятиям | рыхтавацца да заняткаў |
| Топить печь | паліць у печы |
| Поехать на мельницу | паехаць у млын |
| Отличаться по значению (размеру) | адрозніваццца значэннем (памерам) |
| Забыть о прошлом | забыцца на мінулае |
| У меня болит голова | мне баліць галава |
| В целях обеспечения | з мэтай забеспячэння |
| В трёх километрах от города | за тры кіламетры ад горада |
| Ради счастья детей | дзеля шчасця дзяцей |
| Жить по адресу | жыць па адрасе |
| Похожий на отца | падобны да бацькі |
| Писать по адресу | Пісаць на адрас |
| В последнее время | апошнім часам |